аўтамабільнага алею. Ёсць рэкамендацыі апрацоўкі драўніны, на якой з'яўляецца грыбок, антыгрыбковым растворам (на 5 л кіпеню дадаюць 950 г солі і 50 г борнай кіслаты), які наносіцца на пашкоджаную паверхню пэндзлем або губкай.

**ЛІТАРАТУРА**


http://www.derev-grad.ru/lesozaschita/domovye-griby.html
http://www.antiseptik.com/Baza/Client_info/Grib.htm
http://ru.wikipedia.org/wiki/Домовой гриб
http://www.toadstool.ru/spisok-rodov/serpula/serpula-lacrymans-/
http://vperedi.ru/archives/278


УДК 631.51:633.2:631.53.04:631.84(476.6)

# УПЛЫЎ АПРАЦОЎКІ, ТЭРМІНАЎ ПАСЕВУ АДНАГАДОВЫХ ТРАЎ І АЗОТНЫХ УГНАЕННЯЎ НА МІКРАФЛОРУ ГЛЕБЫ

**Таранда М.І., Дудук А.А., Тарасенка П.Л.**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Аднагадовыя травы не толькі важная крыніца зялёнага корму для буйной рагатай жывёлы ў пашавы перыяд, але і добры папярэднік для іншых сельскагаспадарчых культур. Паколькі яны часта высяваюцца без выкарыстання азотных угнаенняў, у розны час, на фоне розных прыёмаў апрацоўкі, то перад намі стаяла задача высветліць, як уплываюць гэтыя фактары не толькі на ўраджайнасць культур, але і на развіццё мікрафлоры ў глебе пасеваў. Гароха-аўсяная сумесь была першай культурай 8-польнага севазвароту. Ранні пасеў у 2011 і 2012 гг. праводзілі 17-18 красавіка, позні − 19-20 траўня. Асноўная апрацоўка праводзілася з восені ў 2010 і 2011 гг. Характарыстыка глебы ўчастка (Зарыца) была наступнай: аградзярнова-падзолістая супясчаная, падасланая марэнным суглінкам на глыбіні 0,8 м, pH (KCl) − 6,1, утрыманне гумусу − 2,18-2,20, $P_2O_5$ − 140-145 мг и $K_2O$ − 170-175 мг на 1 кг глебы.

Вопыт закладваўся на фоне трох варыянтаў апрацоўкі глебы: традыцыйнай – лушчэнне ($Л_{5-7}$) + ворыва ($В_{20}$), неглыбокай − $Л_{5-7}$ + дыскаванне ($Д_{10-12}$) і чызельнай ($Ч_{10-12}Ч_{20}$). У перадпасяўную культывацыю ўносіліся фосфарныя (аманізаваны суперфасфат) і калійныя (KCl) ўгнаенні ($P_{40}K_{70}$), у варыянце з азотнымі ўгнаеннямі – мачавіна ($N_{45}$).

Узоры глебы адбіраліся свідрам з глыбіні 0-20 см з кожнай дзялянкі і ў той жа дзень праводзіўся пасеў яе, пасля прыгатавання развядзенняў, на пажыўныя асяроддзі – МПА, КАА і Сабура з



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

антыбіётыкамі. У выніку пасеву вызначалася ўтрыманне ў 1 г глебы бактэрый аманіфікатараў, актынаміцэтаў і плесневых грыбоў. Іншыя фізіялагічныя групы мікраарганізмаў, такія як нітрыфікатары, азотфіксатары, ўзбуджальнікі брадзільных працэсаў не ўлічваліся. Пасевы бактэрый і актынаміцэтаў інкубаваліся ў тэрмастаце пры тэмпературы 37°С, грыбоў − 28°С. Улік бактэрый праводзілі праз двое сутак, актынаміцэтаў і грыбоў – праз тыдзень. Прычым з групы актынаміцэтаў падлічваліся толькі прадстаўнікі найбольш агранамічна важнага сямейства Streptomycetaceae, якія адрозніваюцца ад іншых утварэннем паветранага міцэлію. Дадзеныя па колькасці асноўных груп мікраарганізмаў у 1 г глебы прадстаўлены ў табліцы.

Табліца – Уплыў апрацоўкі, тэрміну пасеву і азоту на сярэднюю за два гады (2011-2012) колькасць мікраарганізмаў ў глебе пад аднагадовымі травамі

| № п/п | Варыянты: апрацоўка глебы, тэрмін пасеву і азотныя ўгнаенні | Бактэрыі, млн./г | Актынаміцэты, млн./г | Грыбы, тыс./г |
|---|---|---|---|---|
| 1. | $Л_{5\text{-}7}В_{20}$, ранні пасеў | 6,36 | 0,80 | 54,5 |
| 2. | $Л_{5\text{-}7}Д_{10\text{-}12}$, ранні пасеў | 4,90 | 0,59 | 61,5 |
| 3. | $Ч_{10\text{-}12}Ч_{20}$, ранні | 4,70 | 0,81 | 60,5 |
| 4. | $Л_{5\text{-}7}В_{20}$, ранні пасеў $+N_{45}$ | 6,75 | 0,85 | 53,5 |
| 5. | $Л_{5\text{-}7}Д_{10\text{-}12}$, ранні пасеў $+N_{45}$ | 7,00 | 0,64 | 53,0 |
| 6. | $Ч_{10\text{-}12}Ч_{20}$, ранні пасеў $+N_{45}$ | 5,45 | 0,74 | 74,0 |
| 7. | $Л_{5\text{-}7}В_{20}$, позні пасеў | 5,70 | 0,58 | 35,0 |
| 8. | $Л_{5\text{-}7}Д_{10\text{-}12}$, позні пасеў | 5,95 | 0,63 | 46,0 |
| 9. | $Ч_{10\text{-}12}Ч_{20}$, позні пасеў | 3,70 | 0,69 | 40,5 |

Пры раннім пасеве для развіцця бактэрый найбольш спрыяльнай была апрацоўка у выглядзе $Л_{5\text{-}7}В_{20}$ ($6{,}36 \times 10^6$). Унясенне азоту садзейнічала актывацыі іх размнажэння, як у такім жа варыянце апрацоўкі, так і пры неглыбокай − варыянт 5, да 6,75 і 7,00 млн./г адпаведна. Гэтыя ж варыянты апрацоўкі (7 і 8) былі найлепшымі для развіцця бактэрый і пры познім пасеве, але колькасць апошніх ў глебе была меншай (5,70 і 5,95 млн./г). Глеба варыянтаў (3, 6 і 9) з двайной чызельнай апрацоўкай мела мінімальную колькасць бактэрый − 3,70 млн./г.

Актынаміцэты горш развіваліся пры неглыбокай апрацоўцы (варыянты 2, 5 і 8), дзе іх колькасць паніжалася да 0,59, 0,64 і 0,63 млн./г. Найбольш іх утрымлівалася ў глебе з рыхленнем на 20 см.

Позні тэрмін пасеву быў неспрыяльным для развіцця не толькі бактэрый і актынаміцэтаў у глебе, але і, яшчэ больш значна, плесневых грыбоў, якія на фоне $Л_{5\text{-}7}В_{20}$ паніжалі сваю колькасць на 19,5 тыс./г.

Пасля падліку сярэдняй колькасці мікраарганізмаў у кожным варыянце (1-3, 4-6 і 7-9) можна зрабіць наступныя вывады. Азотныя ўгнаенні актывізавалі ў глебе развіццё бактэрый на 20%, колькасць



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

актынаміцэтаў і грыбоў змянілася ў большы бок толькі ў межах памылкі − 1% і 2%. Пры познім пасеве адбылося змяншэнне бактэрыяльнай мікрафлоры на 4%, актынаміцэтаў – на 16% і плесневых грыбоў – 42%. На развіццё мікрафлоры глебы тэрмін пасеву аднагадовых траў уплывае больш, чым азотныя ўгнаенні.

**ЛИТЕРАТУРА**

1. Ничипорович, А.А. Физиология фотосинтеза и продуктивность растений / А.А. Ничипорович // Физиология фотосинтеза : сб. науч. тр. / Ин-т физиологии растений им. К.А. Тимирязева ; под ред. А.А. Ничипоровича. – М., 1982. – С. 7-33.
2. Физиолого-экологические основы оптимизации продукционного процесса агрофитоценозов (поликультура в растениеводстве) / В.Н. Прохоров [и др.] ; ред. А.В. Кильчевский ; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т эксперим. ботаники им. В.Ф. Купревича. – Минск : Право и экономика, 2005. – 368 с.
3. Ламан, Н.А. Концепция биологического потенциала в исследованиях продукционного процесса растений / Н.А. Ламан // Регуляция роста, развития и продуктивности растений : материалы II междунар. науч. конф., г. Минск, 5-8 дек. 2001 г. / Ин-т эксперим. ботаники им. В.Ф. Купревича. – Минск, 2001. – С. 3-7.

УДК 631.53.048:633.11(476.6)

## ФОРМИРОВАНИЕ УРОЖАЙНОСТИ ОЗИМОЙ ПШЕНИЦЫ В ЗАВИСИМОСТИ ОТ НОРМ ВЫСЕВА

**Тарасенко Н.И., Тарасенко В.С.**
УО «Гродненский государственный аграрный университет»
г. Гродно, Республика Беларусь

Важным моментом в повышении урожайности зерновых культур являются оптимальные нормы высева в соответствии со спецификой сортов, уровнем плодородия почвы и сроками сева.

Существуют три главных определяющих показателя структуры урожая: плотность продуктивного стеблестоя, количество зерен в колосе и масса 1000 зерен, а из двух последних складывается и масса зерен с одного колоса. Критерием наилучшей густоты стеблестоя на 1 м. кв., обеспечивающего наивысший урожай, является сочетание оптимальной нормы высева и соответствующей ей продуктивной кустистости.

В настоящее время в республике мы пользуемся нормами высева семян зерновых культур, которые были разработаны на основе рекомендаций 70-х годов еще советских ученых, которые рассматривали кущение как нежелательное явление. Сегодня считают, что при хорошем кущении благодаря нарастанию листовой поверхности образуется большее количество органического вещества, которое используется для образования зерна. В производстве нормы высева семян (из опыта хозяйств Гродненского района) для сортов немецкой селекции состав-



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ